**2013**

______________________________________________
(miestas / rajonas, mokykla)

_________ klasės mokinio (-ės) ______________________________
(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

2013 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

**2013 m. birželio 11 d.** **Trukmė – 4 val. (240 min.)**

## NURODYMAI

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų ar kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Antraštiniame lape užrašykite savo vardą ir pavardę, rajoną / miestą, mokyklą ir klasę (grupę).
- Vertinami tik tie atsakymai, kurie parašyti mėlynai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir trys tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **nurodykite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas.**
- 

Linkime sėkmės!

### EGZAMINO VERTINIMAS TAŠKAIS

| II dalis (teksto suvokimas) | III dalis (rašinys arba interpretacija) | TAŠKŲ SUMA |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2013

## II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

Прачытайце твор У. Караткевіча “Балада пра Вячка, князя людзей простых” і выканайце заданні 1–15.

Як груганы на трупы з высокае гары
Крыжакі наляцелі на вёскі і бары.
Няшчасная краіна тры доўгія гады
Нагбом хляптала трунак смярцей і злой бяды.
Цягнулі па кавалках яе ва ўсе бакі,
Загінулі героі і здрадзілі князькі.
Агонь любові мужнай у брудных душах згас,
Адзін не здрадзіў Вячка, сумленны хлопскі князь.
Параненым і слабым яны яго ўзялі,
Ў кайданы ногі скулі і ў лагер прывялі.
Ад раны, непрытомны, ачнуўся ён тады,
Калі былі далёка айчыны гарады.
.........................................................
Па вуліцы смярдзючай, дзе скупчанасць і бруд,
Вядуць яго на плошчу. А там чакае суд.
......................................................
За подзвігі у бітвах супроць крыжацкіх зграй,
За мужнасць і за гонар трымай адказ, трымай!
Тут, як на браме пекла, магла б пісаць рука:
“Пакіньце спадзяванні – адсюль выводзіць кат”.
Але сканаць пакорным і мяккім, быццам пух,
Як бык дурны на бойні, папаўшы пад абух?
І просіць перад стратай ён путы развязаць,
Каб рукі на імгненне замлелыя размяць.
І ў гэты час апошні перад канцом сваім
Каня яму прывесці, каб развітацца з ім:
.......................................................................
“Мой конь, мой конь, мой любы. Як будзеш жыць цяпер?
Канец лясной свабодзе, мой добры, моцны звер.
Ты грэбаваў зямлёю, што слалася ў нагах,
Няўжо насіць ты будзеш чужога, варага?
Якому не пасуе і назва:”чалавек”,
Ў якога твар, як пятка, не чырванее век.
Не роднае, чужое усё нам тут з табой:
Не так, як на Радзіме, кабылы йржуць вясной,
Не так гамоняць дрэвы, не так звіняць лугі,
Не так куюць падковы для конскае нагі.

Дапамажы мне, косю, мой бездыханны труп
Не проста дол чакае – ганьба, ганебны слуп".
І, выпрастаўшы рукі, меч ката вырваў ён
І ссёк дубовы чэрап з крутых яго рамён,
І на каня узьвіўся, і ў стрэмя горда стаў
І зноў для бітвы волю ў апошні час дастаў.
Меч бліснуў у паветры над лютаю гурбой.
Адзін супроць дзесяткаў – і ўсё ж не прэнг, а бой!
Конь варагоў хапае зубамі і храпіць.
Паўсюль пануе пекла і трупы, як снапы.
О, лепей дні пакончыць на полі баявым,
Ніж век глытаць ў кайданах чужынскіх вогнішч дым!
Вось уцякаюць суддзі, вось кроў плыве ракой:
"Я ў Мар'енбург зьявіўся і ён на час, ды мой.
Пакуль тугія лукі на вежах не звіняць,
Пакуль даўгія стрэлы адтуль не паляцяць".
Але слабеюць сілы, але дрыжыць далонь.
І вось аб труп запнуўся яго любімы конь.
"О конь, не давядзецца табе ў лугах іржаць
І ў полі нам з табою ўжо болей не гуляць.
Я ў стрэлах, быццам вожык. Бывай, мой конь, бывай!
Мы болей не пабачым лугі і родны край".
Аленя абступілі са зграяй злых сабак.
Ірвуць і раздзіраюць, сякуць на дробны мак.
І вось з крывёю гордай зьмяшаўся пыл і гразь.
.........................................................................
Так у баі няроўным загінуў Вячка-князь.
Авой!!!

*Заданні да тэксту (30 балаў)*

| | Балы | | |
|---|---|---|---|
| | I | II | III |
| **1.** Вызначце тэму верша.<br>____________________<br>____________________<br>*(2 балы)* | | | |
| **2.** Вызначце асноўны пафас твора. *Правільны адказ абвядзіце.*<br>А Гераічны.<br>Б Сатырычны.<br>В Трагічны.<br>Г Сентыментальны.<br>*(1 бал)* | | | |
| Сума балаў за заданні 1–2 *(макс. 3 балы)* | | | |

| | Балы I | II | III |
|---|---|---|---|
| **3.** Выпішыце з верша сінанімічнае словазлучэнне да выразу *князь людзей простых*.<br>______________________________<br>*(1 бал)* | __ | __ | __ |
| **4.** Растлумачце сэнс выразу *брудныя душы*.<br>______________________________<br>______________________________<br>*(2 балы)* | __ | __ | __ |
| **5.** Чаму ў радку *Загінулі героі і здрадзілі князькі* аўтар называе здраднікаў не князямі, а князькамі?<br>______________________________<br>______________________________<br>______________________________<br>*(2 балы)* | __ | __ | __ |
| **6.** Як, на вашу думку, ставіцца аўтар да героя твора? Свой адказ падмацуйце цытатамі з тэксту. Выпішыце **тры** цытаты.<br>______________________________<br>______________________________<br>______________________________<br>______________________________<br>*(3 балы)* | __ | __ | __ |
| **7.** Пры стварэнні вобраза крыжакоў аўтар выкарыстоўвае параўнанні. Выпішыце з тэксту **тры** прыклады.<br>______________________________<br>______________________________<br>______________________________<br>______________________________<br>*(3 балы)* | __ | __ | __ |
| **8.** Прыдумайце **тры** эпітэты, якімі можна было б ахарактарызаваць Вячку.<br>______________________________<br>______________________________<br>*(3 балы)* | __ | __ | __ |
| **9.** Чаго больш за смерць баіцца ў палоне Вячка? Адкажыце радкамі верша.<br>______________________________<br>______________________________<br>*(1 бал)* | __ | __ | __ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сума балаў за заданні 3–9 *(макс. 15 балаў )* | | | |

*Балы*
*I II III*

**10.** Аб чым шкадуе Вячка ў апошнія хвіліны жыцця? Як гэта характарызуе героя?

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

*(2 балы)*

**11.** Назавіце **два** творы У. Караткевіча на гістарычную тэму (любых жанраў).

______________________________

______________________________

*(2 балы)*

**12.** Які празаічны твор (аўтар і назва) пра Вячку вы ведаеце?

______________________________

*(2 балы)*

**13.** Растлумачце сэнс выразу *сякуць на дробны мак*.

______________________________

______________________________

*(1 бал)*

**14.** Выпішыце з верша па **два** прыклады ўласнабеларускіх і агульнаславянскіх слоў.

Уласнабеларускія:

______________________________

Агульнаславянскія:

______________________________

*(2 балы)*

**15.** Выпішыце з верша **3** словы з фанетычным падаўжэннем зычных.

______________________________

*(3 балы)*

| Сума балаў за заданні 10–15 *(макс. 12 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | | Члены комиссии | | |
|---|---|---|---|---|
| | Макс. сумма | 1 | 2 | 3 |
| Сума балаў за заданні 1–2 | 3 | | | |
| Сума балаў за заданні 3–9 | 15 | | | |
| Сума балаў за заданні 10–15 | 12 | | | |
| Сума балаў | 30 | | | |
| Акругленая сума балаў | 30 | | | |

## III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

З прапанаваных тэм сачыненняў і тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу. Праца павінна быць аб’ёмам прыблізна 2 старонкі фармата А4 (250–400 слоў). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** Сімвал велічы і нязломнасці ў паэме М. Гусоўскага “Песня пра зубра”.

**2.** Мастацкае асэнсаванне нацыянальнай гісторыі ў рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”.

**3.** Кніга, якая мяне ўразіла.

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4.** **Максім Танк**

**КОЛЕР СНЕГУ**

Нічога больш featurenaкалёрнага,

Нічога больш featurenakalёrnaga,
Як узмяцелены снег,
Я не знаю.

Які ён быў сіні,
Калі замярзаў я
Ў пакоі настылым
Ці, беспрытульны, на вуліцы!

Які быў ружовы,
Калі я страсаў яго з плеч
Той, што прыносіла шчасце!

Які ён быў чорны,
Калі замятаў
След расстання з радзімай!

Які быў чырвоны
На брустверах нашых акопаў!

Які быў іскрысты і светлы,
Калі яго дзеці
Прыносілі мне ў падарунак!

Вось так і не знаю,
Які колер снегу
Сапраўдны.

**5.** **Юрка Гаўрук**

**ДУМА**

Праходзім мы ў шуканнях самых розных,
У дутай радасці гатовыя старацца,
Часамі сумам паліваем розным
Мастацтва.

Адны здаволены, другія ў перамозе,
Паперад бацькі хочуць паказацца.
І гнеў і ласка на тваёй дарозе,
Мастацтва!

Няма на свеце крыўды больш балючай,
Калі над праўдай можна ўсім смяяцца,
І пачалі таптаць пятой калючай
Мастацтва.

Прапала дружба, ворагі ў завулках
Скрывілі вочы, каб не адазвацца.
На Беларусі застагнала гулка
Мастацтва.

Гурток і сход змянілі на дэбошы,
А шлях адзін – хутчэй каб падарвацца.
І выстаўляем брудныя галёшы:
Мастацтва.

Цягнік жыцця бяжыць па рэйках смерці,
А не шукаем роспачы змагацца;
Куплёнай гумачкай адважваемся сцерці
Мастацтва.

Як брыдка, сорамна, не смешна, браце,
Навошта кулачкамі падпірацца?
Бліснуць на хвілю, але ў светлай шаце
Мастацтва!

Мы гордыя, мы сілы многа маем,
Па сцежках топтаных ці нам таптацца?
Няхай звініць і плача па-над краем
Мастацтва!

**6. Якуб Колас**

## У ПАЛЕСКАЙ ГЛУШЫ
(урывак)

Ёсць штосьці незвычайна прыгожае ў гэтых прывольных старасвецкіх шляхах Беларусі. Шырока і размашыста пралягаюць яны ад вёскі да вёскі, ад мястэчак да гарадоў, злучаючы паветы, губерні і цэлыя краіны. Колькі харава і чароўнага прывабу ў сініх іх далях! Колькі новых малюнкаў, свежых матываў і таемных здарэнняў абяцаюць яны вачам і сэрцу падарожнага! З якой незвычайнай сілай парываюць яны да сябе і як моцна дакранаюцца да струн душы! Якая ж сіла заложана ў гэтых прасторах неабнімных родных шляхоў і якую ўладу маюць яны над табою, неспакойны, вечна заклапочаны падарожны? Ці не гэта, нікім не выказаная казка іх, якая складалася доўгімі вякамі і запісвалася агнявымі літарамі людскоє крыўды ў сэрцах мільёнаў падарожных, што ішлі і ехалі па гэтых шляхах і думалі свае думкі? Ці не ён, гэты летапіс часаў, так глыбока западае ў тваю душу, каб адбіцца ў ёй, знайсці свой пэўны вобраз і форму і грознаю маланкаю жахнуць цёмную ноч няволі, што звісла над краем? А можа, гэта таемная і страшная бясконцасць блукання па свеце, дзе трудна вызначыць пачатак і канец, сімваламі якіх з'яўляюцца гэтыя шляхі, авявае душу тваю невыразным хваляваннем і кліча яе зліцца з бяскрайнасцю зямлі? Ці то – няясны адбітак вечнага нездавалення людскога, таемны покліч да шукання іншых форм жыцця, несвядомае імкненне да лепшае долі? Ці то – парыванне душы разбіць нейкія граніцы і вырвацца на бязмежныя прасторы яшчэ нідзе неіснуючай волі?

Эх, шляхі, родныя шляхі! Хто перакажа нам вашы казкі, разгадае думкі, назбіраныя і напісаныя часамі на камлях вашых прысад?

ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 10-й старонцы*

ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 11-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

*Працяг чыставіка*

*I* *II* *III*

*Працяг чыставіка на 13-й старонцы*

*Працяг чарнавіка*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

| III dalis (teksto kūrimas) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Граматнасць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы. | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |